УДК 378.096:[784.4+398.8]:378.4[008+7](476-25)

*У. К. Зяневіч*

## Унікальная школа народна-песеннай творчасці (да 40-годдзя кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору)

*Артыкул з'яўляецца першым крокам у тэарэтычным асэнсаванні фенамена кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Выяўлены генезіс і вызначаны асноўныя этапы станаўлення ўласнай педагагічнай школы. Разглядаюцца напрамкі дзейнасці кафедры – вывучэнне, захаванне і далейшая інтэграцыя народнай песні ў сістэме сучаснай духоўнай культуры Беларусі праз прызму экалогіі культуры.*

Сёлета спаўняецца 40 гадоў з часу стварэння кафедры беларускай народна-песеннай творчасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, з дзейнасцю якой звязаны пачатак прафесійнай народна-песеннай адукацыі ў Беларусі.

Даследаванне адукацыйных працэсаў у сферы прафесійнага народна-песеннага выканальніцтва набывае асаблівую актуальнасць і выклікае зразумелую цікавасць. Вядучая ў краіне кафедра па падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне беларускай народна-песеннай творчасці назапасіла дастаткова станоўчага досведу, які дае падставы для навуковага абагульнення. Аднак аналіз яе дзейнасці (вучэбнай, навуковай, метадычнай, мастацка-творчай) за ўвесь перыяд існавання ад канца 1970-х гг. да нашых дзён усё яшчэ не рэалізаваны. Эпізадычныя матэрыялы, якія з'яўляліся ў перыядычным друку, нешматлікія выступленні кіраўнікоў мастацкіх калектываў кафедры ў сродках масавай інфармацыі, водгукі і рэцэнзіі на канцэртныя праграмы – усяго гэтага недастаткова, каб уявіць сабе тую вялікую працу, якую выкладчыкі, канцэртмайстры, харэографы, лабаранты і студэнты кафедры здолелі здзейсніць у надзвычай складаных умовах трансфармацыі савецкага грамадства і пераходу краіны да новага палітычнага ладу жыцця, рыначных сацыяльна-эканамічных адносін. У навуковай свядомасці Беларусі дзейнасць кафедры амаль не прадстаўлена.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У артыкуле ставяцца *мэты*: тэарэтычна асэнсаваць феномен кафедры беларускай народна-песеннай творчасці; разгледзець гісторыю яе станаўлення і развіцця, асноўныя кірункі дзейнасці; даць характарыстыку стану кафедры на сучасным этапе з канстатацыяй дасягненняў, асвятлення праблемнага поля і перспектыўнага планавання далейшай дзейнасці. Такое асэнсаванне дзейнасці кафедры па фарміраванні прафесійнага народна-песеннага выканальніцтва ў Беларусі можа стаць унёскам у музычна-педагагічную тэорыю і мастацка-творчую практыку.

Даследаванне феномена кафедры актуальнае і ў больш шырокім гісторыка-культурным кантэксце, бо яе дзейнасць у пэўным сэнсе стала фактарам станаўлення і ўмацавання беларускай дзяржаўнасці на важным гістарычным этапе развіцця нашай краіны. Аналізуючы дзейнасць кафедры беларускай народна-песеннай творчасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, паспрабуем абазначыць агульныя тэндэнцыі развіцця прафесійнай народна-песеннай адукацыі ў Беларусі.

Асновы кафедры беларускай народна-песеннай творчасці былі закладзены ў 1977 г., калі ў структуры кафедры харавога дырыжыравання факультэта культурна-асветніцкай працы з’явілася секцыя народна-харавога спеву. Стварэнне секцыі, ініцыяванае рэктарам Мінскага інстытута культуры, было абумоўлена грамадска-культурнымі працэсамі апошняй чвэрці XX ст. і перш за ўсё небывалым росквітам самадзейнай мастацкай творчасці, неверагоднай папулярнасцю ў Беларусі народнага харавога спеву, які займаў важнае месца ў самадзейным мастацкім руху гэтага перыяду.

Самадзейны народна-харавы рух 1960–1970-х гг. падштурхнуў да стварэння шматлікіх харавых калектываў і вакальных ансамбляў народнага плана, агаліўшы пры гэтым недастатковасць і нават адсутнасць кваліфікаваных спецыялістаў – кіраўнікоў народна-харавых калектываў і харавых дырыжораў. Вырашыць гэтую праблему наканавана было Мінскаму інстытуту культуры.

Перад кіраўніцтвам факультэта культурна-асветніцкай работы, у структуру якога ўваходзіла кафедра харавога дырыжыравання, паўстала праблема – знайсці спецыяліста, які мог бы ўзначаліць секцыю народна-харавога спеву. Выбар быў зроблены на карысць маладога таленавітага кіраўніка Народнага хору народнай песні будаўнічага трэста № 5 г. Мінска Станіслава Іосіфавіча Дробыша, хор якога неаднаразова станавіўся лаўрэатам і пераможцам у аглядах-конкурсах самадзейнай народнай харавой творчасці, за што ў 1975 г. С. І. Дробыш атрымаў ганаровае званне заслужанага работніка культуры БССР. Нягледзячы на тое, што праца ў інстытуце прадугледжвала неабходнасць адысці ад дзейнасці з калектывам і перанесці цэнтр намаганняў на педагагічную

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасць, С. І. Дробыш з энтузіязмам прыняў запрашэнне ўзначаліць секцыю. З 1 верасня 1977 г. пры кафедры харавога дырыжыравання пачала дзейнічаць секцыя народна-харавых спеваў. У складзе секцыі, акрамя С. І. Дробыша, працавалі выкладчыкі кафедры С. Ф. Войцік, Л. М. Гаўрына, Л. М. Міхліна, А. С. Папова. У 1978 г. да іх далучыліся Л. В. Снапкова, Л. І. Холупава і Б. У. Сяргееў, у 1979 г. – Г. Д. Сарока (Несцяровіч). У 1980-я – пачатку 1990-х гг. на кафедры выкладалі таксама В. Р. Анісімава і А. М. Злотнікаў, Н. П. Жылінская.

Наступныя чатыры гады для выкладчыкаў секцыі і яе кіраўніка былі перыядам назапашвання педагагічнага досведу, творчага пошуку на шляху станаўлення новай спецыяльнасці, мастацкага эксперымента і актыўнай канцэртнай практыкі. Першы паспяховы выпуск студэнтаў-народнікаў, які адбыўся ў чэрвені 1981 г., прадэманстраваў жыццяздольнасць новага адукацыйнага напрамку, а 3 верасня 1981 г. рашэннем кіраўніцтва Мінскага інстытута культуры секцыя была пераўтворана ў кафедру народнага харавога спеву і атрымала статус самастойнай структурнай адзінкі. Гэтая падзея стала моцным імпульсам для планамернага і інтэнсіўнага развіцця кафедры і першым упэўненым крокам у станаўленні прафесійнай народна-песеннай адукацыі ў Беларусі. Пачалі ствараецца народна-харавыя аддзяленні ў музычных вучылішчах і вучылішчах мастацтваў, выпускнікі якіх папаўнялі шэрагі студэнтаў Інстытута культуры.

Што датычыла напрамку дзейнасці кафедры, было вырашана, што яна павінна развівацца ў парадыгме народна-харавога руху. Кіраўнік кафедры быў перакананы, што народны хор стварае новы культурны базіс, які прыйдзе на змену традыцыйным формам існавання народнай песні. Перад педагогамі паўстала задача, як даць традыцыйнай песні «другое нараджэнне», сучаснае гучанне, якое б адпавядала новым сацыякультурным умовам апошняй чвэрці XX ст. і адначасова не разбурала б экалагічнае культурнае асяроддзе? Сёння на кафедры гэтая праблема вырашаецца шляхам вывучэння і засваення традыцыйнай песеннай культуры, пераймання аўтэнтычнай спеўнай артыкуляцыі.

З 1993 г. кафедра пасля перайменавання стала называцца беларускай народна-песеннай творчасці (загадчык С. І. Дробыш). Яна атрымала статус шматпрофільнага падраздзялення Беларускага ўніверсітэта культуры з асноўнымі напрамкамі: «харавая музыка (народная)» і «фальклорнае мастацтва». У 2004 г. прафілізацыя «народная творчасць. Фальклор» была перададзена кафедры этналогіі і фальклору, якую ўзначаліў В. В. Калацэй, а на кафедры ў 2000 г. з’явілася спецыялізацыя «сольныя спевы (народныя)».

Стварэнне ў Мінскім інстытуце культуры кафедры беларускай народна-песеннай творчасці дало пачатак актыўнай працы па арганізацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучэбнага працэсу: з'явіліся адпаведныя напрамкі падрыхтоўкі, вучэбныя планы, распрацоўваліся методыкі навучання народным спевам. Выкладчыцкаму калектыву давялося перапрафіляваць свае веды. Трэба было засвоіць у поўнай меры эстэтычную сістэму фальклору, умоўна кажучы, стаць на рэйкі практычнай фалькларыстыкі, што па-сапраўднаму ажыццявілі ў 2000-я гг. прадстаўнікі новага пакалення выпускнікоў кафедры.

Нягледзячы на складанасць праблем, якія звычайна паўстаюць на шляху вырашэння новай справы, кафедра адразу знайшла сваю дакладную «ноту». Стаўка была зроблена на практыка-арыентаванае навучанне, у адну з задач якога ўваходзіла прапаганда і папулярызацыя народнага харавога мастацтва.

У 1979 г. быў створаны студэнцкі ансамбль «Валачобнікі», які стаў вучэбна-творчай базай кафедры і адначасова першым па часе ўзнікнення афіцыйна зацверджаным мастацкім калектывам Мінскага інстытута культуры. Папулярнасць яго можна растлумачыць вакальна-харэаграфічнай скіраванасцю. Народная харэаграфія надавала выступленням ансамбля відовішчнасць, бліскучасць, што ў спалучэнні з высокай харавой культурай выклікала непадробны энтузіязм аўдыторыі. Вялікая заслуга ў гэтым была старшага выкладчыка кафедры Валерыя Полева, які кіраваў харэаграфічнай падрыхтоўкай студэнтаў кафедры на працягу 30 гадоў.

Важнай часткай дзейнасці кафедры была экспедыцыйная праца. Падчас фальклорных экспедыцый (з 1980-х гг. былі ў вучэбным плане) даследаваліся вёскі ўсіх этнакультурных рэгіёнаў Беларусі. У выніку быў сабраны багаты фалькларыстычны матэрыял (больш за 40 гадзін запісаў беларускіх народных песень розных жанраў), які ў далейшым выкарыстоўваўся на занятках па расшыфроўцы народных песень, у студэнцкіх навуковых даследаваннях, а найбольш цікавыя ўзоры выконваліся ансамблем «Валачобнікі». Але галоўнае, што давалі гэтыя экспедыцыі – студэнты набывалі досвед народазнаўства, уваходзілі ў эстэтычную сістэму фальклору, знаёміліся з захавальнікамі традыцыі, атрымоўвалі ўяўленне пра рэальнае гучанне беларускай народнай песні.

У 1994 г. ва ўніверсітэце быў створаны ансамбль «Грамніцы» прафесарам кафедры У. К. Зяневічам (які з'яўляецца яго мастацкім кіраўніком). Ансамбль адразу вызначыў эстэтычнае крэда – адраджэнне традыцыйнай народнай культуры. Яго ўзнікненне азнаменавала новы падыход у вучэбнай і творчай дзейнасці, заснаваны на вывучэнні рэгіянальных праяў і мясцовых традыцый беларускага песеннага фальклору. З цягам часу вызначальнай рысай стылю ансамбля стаў шырокі мастацкі дыяпазон ад аўтэнтычных форм традыцыйнай музычнай культуры беларусаў да пошукаў новага гучання ў спалучэнні традыцыйнай манеры народных спеваў з аранжыроўкамі ў сучасных стылях.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКИ

З 2002 г. пачаў творчы шлях ансамбль салістаў «Беларуская песня» (яго ўзначальвае кандыдат педагагічных навук, прафесар, дэкан факультэта музычнага і харэаграфічнага мастацтва І. М. Грамовіч), які стаў сапраўднай творчай лабараторыяй па выхаванні высокакваліфікаваных спецыялістаў, будучых выканаўцаў народнай песні.

У 2013 г. загадчыкам кафедры стала Людміла Леанідаўна Ражкова, кандыдат педагагічных навук (вучылася ў С. І. Дробыша і сумесна працавала з ім у «Валачобніках»). Пад яе кіраўніцтвам праца кафедры актывізавалася: адкрыліся новыя напрамкі даследаванняў, вырасла публікацыйная актыўнасць выкладчыкаў, амаладзіўся кадравы склад, мастацка-творчыя калектывы ажыццявілі шэраг рэзанансных праектаў, узрос рэйтынг кафедры сярод абітурыентаў. Умацавалася роля прадметнай камісіі сольных спеваў, якую ўзначальвае выкладчык кафедры, дацэнт Ларыса Віктараўна Снапкова.

На сённяшні дзень кафедра ўпэўнена трымае статус шматпрофільнага падраздзялення з асноўнымі напрамкамі навучання: «харавая музыка (народная)» і «сольныя спевы (народныя)». Выкладаюцца дысцыпліны спецыяльнасці «народная творчасць (па напрамках)» спецыялізацыі «харавая музыка (народная)», «сольныя спевы (народныя)» і «этнафоназнаўства». Вялікі творчы патэнцыял і шматгадовая педагагічная дзейнасць выкладчыкаў кафедры далі магчымасць выхаваць уласную педагагічную школу.

Асноўнай творчай адзінкай у практычнай падрыхтоўцы студэнтаў стаў мастацка-творчы калектыў (лабараторыя). Пры кафедры створаны тры лабараторыі (імі кіруюць вядучыя спецыялісты), якія назапасілі вялікі прафесійны досвед у галіне народна-песеннай творчасці, – вакальна-харэаграфічны ансамбль імя С. І. Дробыша «Валачобнікі» (мастац. кіраўнік Людміла Ражкова), ансамбль «Грамніцы» (мастац. кіраўнік Уладзімір Зяневіч) і ансамбль салістаў «Беларуская песня» (мастац. кіраўнік Ірына Грамовіч). У гэтых калектывах адбываецца падрыхтоўка студэнтаў усіх чатырох курсаў. Творчы склад удзельнікаў штогод аднаўляецца; на замену выпускнікам у ансамблі ўліваюцца новыя ўдзельнікі – студэнты-першакурснікі. Сістэма творчай лабараторыі дае магчымасць пераемнасці ў навучальным і творчым працэсах, дазваляе засвойваць і замацоўваць вакальна-пеўчыя і акцёрска-сцэнічныя навыкі і ўменні ва ўзаемадзеянні старшакурснікаў і студэнтаў малодшых курсаў, спрыяе назапашванню стабільнага рэпертуару. Мадэлюецца сітуацыя традыцыйнага фальклорнага ансамбля, дзе досвед вопытных выканаўцаў перадаецца да пачаткоўцаў натуральным чынам.

Асноўная задача студэнцкіх мастацка-творчых лабараторый – вывучэнне беларускага песеннага фальклору ва ўсім багацці рэгіянальных праяў і творчае ўвасабленне яго ў сучаснай мастацкай практыцы на аснове тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў, атрыманых у працэсе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праходжання спецыяльных дысцыплін (беларуская народна-песенная творчасць, расшыфроўка і харавая аранжыроўка беларускай народнай песні). Такім чынам рэалізуецца прынцып паслядоўнасці, паэтапнага вывучэння традыцыйнага песеннага фальклору. Паралельна з гэтым адбываецца падрыхтоўка ў спецыяльных курсах «Рэгіянальныя пеўчыя стылі», «Хоразнаўства», «Методыка працы з народным калектывам», «Методыка выкладання спецыяльных дысцыплін» і ў практычных вакальна-харавых дысцыплінах (дырыжыраванне, пастаноўка голасу). Дадаткова на 1-м курсе студэнты вывучаюць тэмбравыя характарыстыкі народнага спеву, артыкуляцыйныя прыёмы ў працэсе праходжання дысцыпліны «Этнафоназнаўства». На 4-м курсе выпускнікі самастойна рыхтуюць дыпломныя праекты ў форме канцэртнага сцэнічнага паказу сваіх кваліфікацыйных хормайстарскіх праграм, якія паўстаюць у якасці яркіх, маляўнічых тэатралізаваных пастановак. Час ад часу для стварэння буйных мастацка-творчых праектаў або падрыхтоўкі да масавых святочных выступленняў на кафедры выкарыстоўваецца форма аб'яднанага хору.

Выкладчыкамі кафедры праводзяцца заняткі па спецыяльных дысцыплінах, такіх як «Беларуская народна-песенная творчасць», «Харавы клас», «Пастаноўка голасу», «Сольныя і ансамблевыя спевы», «Дырыжыраванне», «Расшыфроўка запісаў народных песень», «Харавая аранжыроўка», «Хоразнаўства і методыка работы з фальклорным калектывам», «Рэгіянальныя пеўчыя стылі», «Харавая літаратура», «Танец у народным хоры», «Вытворчая і педагагічная практыка». Яны таксама распрацавалі аўтарскія курсы па дырыжыраванні (Л. І. Холупава), хоразнаўстве (С. Ф. Войцік), беларускай народна-песеннай творчасці (У. К. Зяневіч). У навучальным працэсе важнае месца адводзіцца вывучэнню песеннага фальклору беларусаў.

На лекцыйных занятках па беларускай народна-песеннай творчасці студэнты вывучаюць фальклор як феномен духоўнай культуры народа ў сацыя- і гісторыка-культурным кантэксце яго развіцця, аналізуюць сучасны стан народнай песеннай традыцыі ў Беларусі, прасочваюць тэндэнцыі ўплыву аўтэнтычнага песеннага фальклору на сцэнічны фальклорызм і адваротныя тэндэнцыі ўздзеяння сучаснай культуры на культуру традыцыйную. Прынцыповым з'яўляецца падыход кафедры да вывучэння песеннага фальклору як формы пераймання і захавання традыцыйнай культуры.

У класах харавым і сольных спеваў вялікая ўвага надаецца пытанням народнай артыкуляцыі, выяўленню яе этнічнай спецыфікі, разуменню семантычнай асновы гуку ў народнай традыцыі. У працэсе развучвання песні студэнты засвойваюць прыёмы абрадавага, меладэкламацыйнага і спеўнага інтанавання, выяўляюць тэмбравую семантыку народнай песні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прафесійнае майстэрства студэнты ўдасканальваюць у працэсе праходжання вытворчай і педагагічнай практыкі ў прафесійных або аматарскіх мастацкіх калектывах, навучальных установах культуры і мастацтваў.

Прафесарска-выкладчыцкім саставам кафедры вядзецца актыўная навукова-метадычная работа. У 1980-я гг., калі адчувалася вострая нястача вучэбна-метадычнага матэрыялу, супрацоўнікі прыклалі немалыя намаганні для стварэння трывалай вучэбна-метадычнай базы. За кароткі тэрмін былі выдадзены вучэбныя праграмы па ўсіх спецыяльных дысцыплінах кафедры, вучэбна-метадычныя дапаможнікі, «Хрэстаматыя па дырыжыраванні» (1984). У 2000-я гг. па меры назапашвання выкладчыкамі кафедры прафесійнага досведу і яго тэарэтычнага абагульнення, навукова-метадычная дзейнасць выйшла на якасна новы ўзровень. У гэты перыяд былі створаны грунтоўныя навучальныя дапаможнікі, выдадзены курс лекцый «Хоразнаўства» (2014) Л. М. Гаўрынай, хрэстаматыя «Беларуская народная песня» (2000) У. К. Зяневіча, «Дырыжыраванне: хрэстаматыя для народнага хору» (2008) С. І. Дробыша, С. Ф. Война і Л. І. Холупавай, вучэбна-метадычны дапаможнік «Несимметрические размеры в хоровом педагогическом репертуаре» (2000) С. Ф. Войцік, Л. К. Міхальковай, Л. І. Холупавай (складальнікі) і «Сложные симметрические размеры: хоры a cappella» (2018, т. 1) Л. І. Холупавай, А. І. Дубавец і І. В. Селінай (складальнікі); вучэбна-метадычныя дапаможнікі «Пастаноўка голасу» (2013) Л. І. Холупавай, І. М. Грамовіч і Л. Л. Ражковай, «Аранжыроўка беларускіх народных песень» (2014, 2018) У. К. Зяневіча; «Белорусские народные инструменты (дудка): от теории к практике» (2014) А. А. Петрука; рэпертуарныя зборнікі «Ансамбль беларускай народнай песні» (2006) Г. Д. Несцяровіч, Л. І. Холупавай, А. І. Дубавец, «Пастаноўка голасу і вакальны ансамбль» (2008) Л. І. Холупавай, І. М. Грамовіч, Л. Л. Ражковай, «Наша спадчына» (2012) С. І. Дробыша, С. Ф. Войцік і Л. І. Холупавай, «Заўсёды сучасная дудка» (2016) А. А. Петрука, «Люблю наш край, старонку гэту» (2017) Л. І. Холупавай, Г. Д. Несцяровіч і А. І. Дубавец, «Беларусь – мая песня» (2018) С. Ф. Войцік і М. В. Сіраты.

У полі зроку выкладчыкаў кафедры агульная праблематыка беларускага песеннага фальклору, пытанні вызначэння адметнасці яго стылю, музычнай мовы і спецыфікі песенных жанраў, этнічныя характарыстыкі беларускай песеннай спадчыны. Актуальнай задачай з'яўляецца стварэнне электроннага каталога захавальнікаў народнай пеўчай традыцыі, якія дзейнічалі і дзейнічаюць на тэрыторыі Беларусі, удакладненне карты распаўсюджвання беларускіх этнаграфічных калектываў. У даследчай рабоце выкладчыкаў кафедры плануецца выяўленне самабытнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

артыкуляцыі беларусаў у кантэксце распрацоўкі рэгіянальнай спецыфікі беларускай песеннай традыцыі.

Асноўная навуковая і практычная дзейнасць выкладчыкаў кафедры сканцэнтравана на выканальніцкім фальклярызме (народны хор, народны вакальны ансамбль, сольныя спевы), паглыбленні ў сутнасць яго феномена. Змена традыцыйнага асяроддзя бытавання народнай песні (канцэртнае выкананне ў сцэнічных умовах) прыводзіць да неабходнасці ўносіць істотныя карэктывы як у яе змест, так і ў працэс выканання. Узнікае неабходнасць, з аднаго боку, захаваць аўтэнтычную песенную традыцыю, вызначыць і выкарыстаць асаблівасці народнай пеўчай артыкуляцыі, з другога – гарманічна збалансаваць суадносіны аўтэнтычнай манеры спеву і сцэнічнай выканальніцкай манеры. У гэтай сувязі на кафедры распрацоўваюцца інавацыйныя методыкі працы з народнымі спевакамі, высвятляюцца пытанні жанравай семантыкі гуку ў фальклорнай традыцыі, аналізуюцца суадносіны народнай артыкуляцыі і артыкуляцыі ў народным хоры, выпрацоўваюцца крытэрыі класіфікацыі народна-пеўчых калектываў.

Адным з новых высокатэхналагічных кірункаў дзейнасці кафедры з'яўляецца праблематыка камп'ютарнага даследавання гуку ў народнай песеннай традыцыі. Гэты перспектыўны напрамак дае магчымасць выйсці на больш глыбокае разуменне спецыфікі народнага спеву і ў той самы час стварае ўмовы для эксперымента ў галіне полістылістыкі.

У апошнія гады супрацоўнікамі кафедры беларускай народна-песеннай творчасці распрацаваны дзве комплексныя навуковыя тэмы: «Станаўленне прафесійнай школы народна-песеннага выканальніцтва Беларусі» (2015–2020) і «Традыцыйная песенная культура Беларусі: рэгіянальны аспект» (2021–2025), апублікаваны шэраг артыкулаў, укаранёны новыя методыкі выкладання і ацэнкі ведаў студэнтаў (модульная сістэма, тэсты, рэйтынгі), складзены анатаваны каталог выданняў па беларускай народнай музычнай творчасці.

Кожны супрацоўнік кафедры не толькі ўдзельнічае ў кафедральных даследаваннях, але і працуе па індывідуальнай тэматыцы. Навуковая праца І. М. Грамовіч звязана з педагогікай (гэтай тэматыцы яна прысвяціла больш за 30 работ). У сферу навуковых інтарэсаў Л. Л. Ражковай уваходзяць праблемы навучання, фарміравання нацыянальнай самасвядомасці сродкамі фальклору. У рамках гэтай праблематыкі ёю апублікавана 25 навуковых артыкулаў. Беларускае музычнае мастацтва ў перыяд станаўлення беларускай савецкай дзяржаўнасці ў 20-я гг. XX ст. стала тэмай навуковага даследавання У. К. Зяневіча, які шэраг публікацый прысвяціў розным аспектам беларускай музыкі. В. І. Раманенкава ў рэчышчы дысертацыі «Рымска-каталіцкая пасхальная царкоўная і бытавая традыцыі ў Беларусі: мастацтвазнаўчая рэканструкцыя» пра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цягвае вывучэнне гэтага феномена, таксама даследуе пытанні гісторыі і тэорыі культуры Беларусі, беларускага фальклору і этнамузыкалогіі (апублікавала 10 работ па розных тэмах). Распрацоўкай тэматыкі сучасных адукацыйных тэхналогій займаецца Л. І. Холупава. Не абмяжоўваецца рамкамі кафедральнай тэматыкі і навуковая дзейнасць маладых выкладчыкаў. А. Ю. Валодчанка, І. У. Канцэвіч і А. І. Сілаева працуюць над завяршэннем дысертацыйных даследаванняў.

Выкладчыкі кафедры штогод удзельнічаюць у міжнародных навукова-практычных і навукова-метадычных канферэнцыях у Беларусі, Украіне, Расіі і інш. У гэтым годзе адбылася III кафедральная канферэнцыя «Гісторыя, тэорыя і практыка фальклору», прысвечаная памяці С. І. Дробыша. Вырасла колькасць замежных публікацый. Чатыры выкладчыкі кафедры маюць ступень кандыдата мастацтвазнаўства і педагагічных навук, двое – навуковае званне дацэнта. З 2015 г. пад іх кіраўніцтвам абаронена 10 магістарскіх дысертацый, выканана больш за 30 дыпломных работ у галіне традыцыйнай мастацкай культуры і музычнага мастацтва Беларусі.

Мастацка-творчая дзейнасць кафедры добра вядомая ў краіне і па-за яе межамі. Калектывы мастацкай творчасці носяць званні лаўрэатаў міжнародных конкурсаў і фестываляў, з'яўляюцца лаўрэатамі і дыпламантамі прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, пастаянна ўдзельнічаюць ва ўсіх буйных форумах фальклору ў краіне і за мяжой.

Вельмі прыкметная і грамадская дзейнасць супрацоўнікаў кафедры. Кафедра народна-песеннай творчасці з'яўляецца сузаснавальнікам і арганізатарам правядзення конкурсаў рэспубліканскіх («Жывая крыніца»; аранжыровак беларускай народнай песні, 2018) і ўніверсітэцкіх (маладых выканаўцаў народнай песні «Галасы Радзімы», 2019–2021).

У. К. Зяневіч, І. М. Грамовіч, Л. Л. Ражкова, Л. В. Снапкова працуюць у складзе камісіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь па прысваенні званняў мастацкім аматарскім калектывам, у складзе журы міжнародных, рэспубліканскіх і гарадскіх конкурсаў. У. К. Зяневіч, Л. І. Холупава, І. М. Грамовіч з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі Беларускага саюза музычных дзеячаў.

Гонарам кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору з'яўляюцца яе выпускнікі. Высокапрафесійная падрыхтоўка дазваляе будучым спецыялістам паспяхова кіраваць аматарскімі і прафесійнымі харамі і ансамблямі, працаваць выкладчыкамі вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, педагогамі музычных школ і студый, метадыстамі па народнай творчасці, салістамі і артыстамі прафесійных калектываў. Выпускнікі кафедры (звыш 300 чалавек) – гэта спецыялісты, якія выконваюць найважнейшую задачу – захаванне нацыя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нальных асноў айчыннай культуры. Многія з іх маюць вучоныя ступені кандыдатаў навук, вучоныя званні дацэнтаў, ганаровыя званні заслужаных артыстаў і заслужаных работнікаў культуры Беларусі, з'яўляюцца лаўрэатамі міжнародных і рэспубліканскіх конкурсаў і фестываляў.

Сёння кафедра працягвае высокую духоўную місію захавання і развіцця айчыннага народнага песеннага мастацтва ва ўсіх аспектах дзейнасці: ажыццяўляецца падрыхтоўка спецыялістаў па напрамках «харавая музыка (народная)», «сольныя спевы (народныя)» і «этнафоназнаўства» па адукацыйным цыкле бакалаўра. У перспектыве плануецца рэалізаваць адукацыйныя праграмы па магістратуры і аспірантуры.

Феномен кафедры народна-песеннай творчасці і фальклору БДУКМ забяспечаны самаадданым стаўленнем яе выкладчыкаў да сваёй працы. Эфектыўная адукацыйная, выхаваўчая, навуковая і мастацка-творчая дзейнасць, педагагічны талент і прафесійная кампетэнтнасць супрацоўнікаў, атмасфера добразычлівасці і творчасці, якая пануе на кафедры, надалі ёй заслужаную павагу і аўтарытэт. Кафедра народна-песеннай творчасці і фальклору на сучасным этапе – гэта ўнікальны адукацыйны цэнтр, якому належыць вядучая роля ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне народна-харавога і сольнага народнага выканальніцтва. Трывалыя традыцыі, якія склаліся ў дзейнасці кафедры, заснаваныя на ўзаемным даверы і падтрымцы, паважлівым стаўленні да студэнтаў, уменні адэкватна рэагаваць на выклікі часу, дазваляюць з аптымізмам глядзець у будучыню.

*U. Zyanevich*

**A unique school of folk songs (to the 40th anniversary of the Department of Folk Song and folklore)**

*The article is the first step in the theoretical understanding of the phenomenon of the Department of Folk Song and Folklore of the Belarusian State University of Culture and Arts. The genesis and the basic stages of formation of own pedagogical school are revealed. The author touched upon issues related to the directions of the department's activity through the prism of ecology of culture as one of the forms of studying, preservation and further integration of folk song in the system of modern spiritual culture of Belarus are considered.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 06.10.2021.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ